*Сувалаў А. М.* **Падыходы да праблемы этнагенезу беларусаў у навуцы XX ст.**

На пачатак XX ст. айчынная навука прайшла некалькі этапаў у развіцці канцэпцый этнагенезу беларусаў. Так, за перыяд канца XVIII – пачатку XX ст. былі сфармуліраваны тры асноўныя канцэпцыі этнагенезу беларусаў: вялікаруская, польская і навуковая канцэпцыя Я.Ф. Карскага. Узнікненне і развіццё вялікарускай і польскай канцэпцый стала вынікам палітыка-ідэалагічных запатрабаванняў свайго часу. Таму першапачаткова яны не мелі навуковага абгрунтавання, а іх сутнасць заключалася ў адмаўленні беларусам у праве на этнічную самастойнасць. Толькі з другой паловы XIX ст. вялікаруская і польская канцэпцыі набылі пэўнае навуковае напаўненне. У прыватнасці былі дасягнуты наступныя вынікі: вызначана этнічная аснова беларускага этнасу (тры ўсходнеславянскія племені: полацка-смаленскія крывічы, дрыгавічы і радзімічы з удзелам груп іншых як славянскіх, так і неславянскіх плямён); пераадолена раней існаваўшая ідэя аб атаясамленні рэлігійнай прыналежнасці з этнічнай; вызначаны асноўныя прыкметы этнасу: агульнасць мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры, этнічнай тэрыторыі, агульнасць гістарычнага мінулага, этнічная самасвядомасць; акрэслены арэал распаўсюджання беларускага этнасу; вызначаны час утварэння беларускага этнасу; выяўлены і прааналізаваны фактары, якія ўплывалі на працэс этнаўтварэння.

Фарміраванне першай навуковай канцэпцыі этнагенезу беларусаў Я. Ф. Карскага было абумоўлена агульным развіццём беларусазнаўства, даследаваннямі ў галіне, перш за ўсё, мовазнаўства, этнаграфіі, фальклора, гісторыі Беларусі, археаграфічнай працы, і, у меншай ступені, археалогіі і антрапалогіі. Згодна з канцэпцыяй Я.Ф. Карскага беларусы прызнаваліся трэцім самастойным усходнеславянскім народам, які сфарміраваўся ў XIII ст. на аснове трох славянскіх плямёнаў (крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў) з удзелам неславянскіх элементаў (некаторых плямёнаў балтаў) і паасобных груп іншых усходніх славян [1, с. 64–65, 80].

З пачатку і да 40-х гг. XX ст. погляды акадэміка Я. Ф. Карскага ўдакладняліся і развіваліся ў навуковых даследаваннях

М.В. Доўнар-Запольскага [2], Ф.Т. Канстанцінава [3], А.П. П'янкова [4] і іншых аўтараў. У гэты час не адбываецца каардынальных змен у падыходах да праблемы этнагенезу беларусаў, акрамя таго, што ўсё большы акцэнт ставіцца на агульным усходнеславянскім паходжанні беларусаў, вялікарусаў і ўкраінцаў.

Сітуацыя мяняецца з пачатку 50-х гг. XX ст., калі Інстытутам гісторыі АН БССР было распачата комплекснае даследаванне тэмы паходжання беларусаў. Выхадам значнай колькасці артыкулаў і манаграфій, прысвечанай тэме этнагенезу беларусаў, адзначыліся 60-я гг. XX ст. [5; 6]. Указаныя змены адбываліся і дзякуючы працэсам, якія працякалі ў цэлым у тагачаснай савецкай гістарычнай навуцы. Так, у гэты перыяд з'яўляюцца даследаванні па гісторыі гістарычнай навукі ў Расіі і Беларусі, друкуюцца працы прысвечаныя выдатным даследчыкам і навукоўцам, а таксама перавыдаюцца некаторыя дарэвалюцыйныя даследаванні.

Палітыка-ідэалагічны фактар, які значна ўплываў на вырашэнне самой праблемы этнагенезу беларусаў на працягу ўсяго разглядаемага перыяду, яскрава праявіўся ў фарміраванні канцэпцыі пра старажытнаускую народнасць, якая найбольш рэльефна праявілася з другой паловы 50-х г. XX ст. Сутнасць гэтай канцэпцыі састаяла ў ідэі існавання адзінай старажытнарускай (усходнеславянскай) супольнасці, якая лічылася этнічнай «калыскаю» трох братніх усходнеславянскіх народаў: вялікарусаў, украінцаў і беларусаў [6; 8; 9, с. 103]. Указаная канцэпцыя ідэалагічна і палітычна выдатна стасавалася з ідэяй пра пабудову новай супольнасці – савецкага народа. Таму канцэпцыя пра старажытнарускую народнасць як агульную аснову трох усходнеславянскіх народаў атрымала папулярнасць у савецкай гістарыяграфіі, а яе крытыка стала непажаданай.

Менавіта ва ўказных умовах адбываюцца спробы перагляду існуючых схем, здзейсненыя В.В. Сядовым [10–12], М.І. Ермаловічам [13] і інш. тагачаснымі даследчыкамі. Рост папулярнасці навуковых тэорый, якія аб'ектыўна абвяргалі факт існавння старажытнарускай народнасці як этнічнай асновы трох усходнеславянскх народаў, і быў галоўнай падставай для падрыхтоўкі маштабнай навуковай канферэнцыі. З пазіцый ідэалагічнага характару задача канферэнцыі састаяла ў навуковым

абвяржэнні поглядаў В.В. Сядова, М.І. Ермаловіча і іх прыхільнікаў.

Аднак як сама канферэнцыя, так і падрыхтаваныя да яе правядзення матэрыялы, апынуліся пад забаронаю. Забарона стала следствам тых жа ідэалагічных падстаў, паколькі большасць прадстаўленых на яе навуковых матэрыялаў сведчыла на карысць удзелу «балцкага субстрата» у этнагенезе беларусаў [14]. Бібліёграфы тагачаснага дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР В.К. Бандарчыка (які быў адным з ініцыятараў правядзення ўказанай канферэнцыі) сцвярджаюць, што менавіта па прычыне яго актыўнай пазіцыі ў дачыненні да падрыхтоўкі канферэнцыі, праца апошняга пачала успрымацца ў ЦК КПБ у якасці «нацыяналістычнай» (у самым дрэнным сэнсе гэтага паняцця), а ён сам быў вымушаны сысці з пасады [15]. На пэўны час тэорыя «балцкага субстрата», як і любыя іншыя спробы перагляду канцэпцыі пра старажытнарускую народнасць як агульную аснову трох усходнеславянскіх народаў. Нават у абагульняючых і гістарыяграфічных даследаваннях указаная праблема або не разглядалася навугул [16], або закраналася толькі часткова [17, с. 155–178].

Новая хваля навуковага інтарэсу як да самой праблемы этнагенезу беларусаў, так і да матэрыялаў забароненай канферэнцыі 1973 г. звязана з перыядам перабудовы і дэідэалагізацыі. Такім чынам, можна ўказаць, што наяўнасць рэальнага плюралізму ў навуковая сферы дае магчымасць вучоным прадстаўляць на суд грамадскасці разнастайныя варыянты бачання мінулага.

Літаратура

1. Карский, Е.Ф. Белорусы: в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Вильна, 1904. – Т.1.

2. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі – Мінск, 1994.

3. Канстанцінаў, Ф.Т. Аб паходжанні беларускага народа / Ф.Т. Канстанцінаў. – Мінск, 1946.

4. Пьянков, А.П. Происхождение белорусского народа / А.П. Пьянков. – Минск, 1948.

5. Гринблат, М.Я. Белорусы: очерки происхождения и этнической истории / М.Я. Гринблат. – Минск, 1968.

6. Карнейчык, Я.І. Беларуская нацыя: гістарычны нарыс / Я.І. Карнейчык. – Мінск, 1969.

7. Тихомиров, М.Н. Значение Древней Руси в развитий русского, украинского и белорусского народов / М.Н. Тихомиров // Вопросы истории. – 1954. – № 6. – С. 19–26.

8. Токарев, С.А. О культурной общности восточнославянских народов / С.А. Токарев // Советская этнография. – 1954. – № 2. – С. 21–32.

9. Народы Европейской части СССР : в 2 т. – М., 1964. Т.1.

10. Седов, В.В. Еще раз о происхождении белорусов / В.В. Седов // Советская этнография. – 1969. – № 1. – С. 105–121.

11. Седов, В.В. К происхождению белорусов (проблема балтского субстрата в этногенезе белорусов) / В.В. Седов // Советская этнография. – 1967. – № 2. – С. 112–129.

12. Седов, В.В. О происхождении белорусов / В.В. Седов // Древности Белоруссии: материалы конф. по археологии Белоруссии и смежных территорий. – Минск, 1966. – С. 301–309.

13. Ермолович, М. Где была летописная Литва ? / М. Ермолович // Тезисы докладов к конференции по археологии Белоруссии. – Минск, 1969. – С. 233–238.

14. Этногенез белорусов. – Минск, 1973.

15. Хворов, В. Василий Кириллович Бондарчик / В. Хворов // Наследие Слуцкого края [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа: http: //nasledie-sluck.by/ru/people/Historians/4801/ – Дата доступа: 01.02.2017.

16. Михнюк, В.Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В.Н. Михнюк – Минск, 1985.

17. Михнюк, В.Н., Петриков П.Т. Историческая наука Белорусской ССР в 80-е годы / В.Н. Михнюк, П.Т. Петриков. – Минск, 1987.

## ***Глосикова О., Мушинский Н. И.*** **Толерантность и нравственность как коэволюционные факторы на примере истории Словакии и Беларуси**

Коэволюционная онтология заложила основы для понимания того факта, что новая цивилизационная парадигма должна выстраиваться на признании включённости эволюции культуры и социо-